Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры
і мастацтваў”
___________Ю.П.Бондар
“____”___________2011 г.

# ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ

*Праграма дзяржаўнага экзамену для студэнтаў напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная) спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнікі:**

*А.І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", доктар культуралогіі, прафесар;

*Л.К. Кухто,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*А.М. Кушнярэвіч,* загадчык кафедры культуралогіі і міжнароднага турызму ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт", доктар мастацтвазнаўства, прафесар;

*А.І. Сцепанцоў,* загадчык кафедры менеджменту СКД установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 26.01.2011 г.);

саветам факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 09.02.2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *А.І.Смолік*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Удасканаленне сістэмы адукацыі, уключаючы вышэйшую школу, прадугледжвае фарміраванне новых падыходаў, накіраваных на набліжэнне падрыхтоўкі спецыялістаў да еўрапейскіх і сусветных стандартаў. Сярод іх найбольш значнае месца займае антрапакультуралагічная парадыгма і сацыялагічны падыход. Гэтая акалічнасць асабліваe значэнне мае для студэнтаў універсітэта культуры і мастацтваў. Выпускнікі ўніверсітэта будуць працаваць на ніве культуры, дзе вельмі значнае месца адыгрывае чалавекатворчая сутнасць культуры, найвышэйшае назначэнне якой – фарміраванне і развіццё асобы, яе духоўнага свету, жыццёвых пазіцый, сэнсажыццёвых установак у развіцці грамадства і адначасова працэс стварэння каштоўнасцей культуры .

Дадзеная праграма складзена з улікам змен адукацыйнай парадыгмы і вызначаецца стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі. Праграма адлюстроўвае ўнутраную логіку вывучаемых метадычных праблем, арыентуе будучых спецыялістаў на дзейнасць па авалоданні сучаснымі тэхналогіямі навучання і выхавання.

*Мэтай* дзяржаўнага экзамену па “Тэорыі і гісторыі культуры” з’яўляецца высвятленне сфарміраванасці ў студэнтаў трывалых навыкаў і ўменняў, якія неабходны для рацыянальнай арганізацыі выкладання культуралагічных дысцыплін як вучэбнага прадмета, а таксама для паспяховага вырашэння навукова-даследчых задач у сферы культуры.

Падчас падрыхтоўкі да дзяржаўнага экзамену і ў працэсе яго вырашаюцца наступныя *задачы:*

– высвятленне наяўнасці ў выпускнікоў універсітэта сістэмы ведаў па тэорыі і гісторыі культуры;

– выяўленне ступені авалодання студэнтамі ўсеагульнымі заканамернасцямі функцыянавання культуры;

– вызначэнне ўзроўню асэнсаванасці выпускнікамі сутнасці культуры і заканамернасцей яе дынамікі, унікальнага вопыту дыялога культур, што асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі;

– высвятленне грунтоўнасці ведаў па праблемах марфалогіі, тыпалагізацыі культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– высвятленне ступені сфарміраванасці ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў культуры, які грунтуецца на авалоданні імі сучаснымі метадалагічнымі падыходамі.

У працэсе падрыхтоўкі студэнтаў да дзяржаўнага экзамену па дадзенай праграме яны павінны сістэматызаваць і паглыбіць веды па:

– важнейшых метадалагічных парадыгмах, прынцыпах і метадах культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы;

– асноўных заканамернасцях культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– методыцы прагназавання, планавання і ажыццяўлення дзейнасці ў галіне культуры;

– сэнсе і сутнасці базавых сімвалаў сусветнай і нацыянальнай культуры;

– асноўных этапах развіцця культуры ў сувязі з сусветнай гісторыяй чалавецтва;

– суадносінах культуры і цывілізацыі, характэрных асаблівасцях розных тыпаў культуры, у тым ліку сучаснай айчыннай культуры;

– асноўных культурных дасягненнях пэўных геаграфічных рэгіёнаў і народаў;

– асноўных артэфактах культуры, створаных геніямі чалавецтва.

У працэсе дзяржаўнага экзамену выпускнікі павінны паказаць навыкі і ўменні, якія неабходны для:

– ацэньвання стану, тэндэнцый і перспектыў развіцця сучаснай культуры;

– крытычнага ўспрымання разнастайных з'яў культуры ў іх суаднесенасці з іншымі сферамі сацыяльнай жыццядзейнасці;

– выяўлення сувязі культуралогіі з рэлігійнымі, філасофскімі пошукамі, дасягненнямі навукі і адукацыі;

– асэнсавання значэння культуры як індыкатара стану грамадства;

– аналізу артэфактаў культуры з семіятычнага, аксіялагічнага пунктаў гледжання;

– даследавання твораў класічнай і масавай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

## Тэма 1. Дысцыплінарны статус культуралогіі як вучэбнай і навуковай дысцыпліны

Культуралогія як эксплiцытная форма ведаў аб феноменах культуры. Актуальнасць вывучэння культуралагічных праблем. Месца культуралогіі ў структуры гуманітарных ведаў. Культуралогія як сістэма ведаў аб культуры. Гісторыя ўзнікнення і прычыны фарміравання культуралогіі. Неабходнасць універсальнага падыходу да культуры: адзінства асобаснага, сацыяльнага і глабальнага аспектаў.

Мэты і задачы культуралогіі. Асноўныя функцыі культуралогіі: светапоглядная, гнасеалагічная, аксіялагічная, праксеялагічная, метадалагічная і інш.

Дыверсіфікацыя навук аб культуры. Фундаментальная і прыкладная культуралогія. Значэнне культуралогіі ва ўмовах міжнародных камунікацый, інфармацыйнага грамадства, глабалізацыі.

## Тэма 2. Станаўленне і развіццё культуралагічных ведаў

Этымалогія канцэпту "культура". Метадалагічныя ўяўленні аб культуры ў антычным грамадстве. Паглыбленне разумення сутнасці культуры ў працах філосафаў Сярэднявечча (К.С.Ф.Тэртуліяна, А.Блажэннага, Ф.Аквінскага).

Дасягненне культуралагічнай думкі ў эпоху Адраджэння. Погляды на культуру М.Мантэня, Э.Ратэрдамскага, М.Кузанскага, Т.Кампанелы.

Культуралагічныя веды ў эпоху Асветніцтва. Погляды на культуру ў працах Р.Дэкарта, Дж.Лока, Ф.Бэкана, Дж.Віко, Ж.-Ж.Русо, Фр.М.А.Вальтэра, Т.Гобса.

Развіццё культуралагічных ведаў у індустрыяльным грамадстве. Культуралагічная праблематыка ў працах І.Канта, Ф.Гегеля, Ф.Ніцшэ і іншых філосафаў.

Трактоўка культуралагічных праблем у ХХ ст. Феномен духоўнага фарміравання асобы ў працах рускіх філосафаў. Экзістэнцыяльная культурфіласофія. Постмадэрнісцкая трактоўка культуралагічных праблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 3. Асэнсаванне феномена культуры

Разнастайнасць падыходаў да паняцця “феномен”. Фенаменалагічны метад: эпохэ, рэдукцыя і ідэацыя. Чысты феномен як структура сэнсу. Культура як сістэма ўніверсальных, унікальных феноменаў.

Спецыфіка і ўзаемасувязь феноменаў. Праблема класіфікацыі феноменаў культуры. Сінкрэтычная і аналітычная дыферэнцыяцыя культуры.

Культура як сістэма, што самаразвіваецца. Анталагічны і гнасеалагічны сэнс культуры. Культурная разнастайнасць і неабходнасць яе даследавання. Заканамернасці і механізмы функцыянавання і развіцця культуры як атрыбута сацыяльнай сістэмы. Раскрыццё ўнутраных сэнсаў артэфактаў культуры, вобразаў, формы і сэнсаў, якія ўтрымліваюцца ў іх, задача навукі аб культуры.

Дэтэрмінанты разнастайнасці падыходаў, кірункаў і школ у разуменні культуры. Вызначэнне культуры Э.Тайларам. Асноўныя аспекты розных падыходаў да вызначэння сутнасці і сэнсаў культуры: абстрактнае вызначэнне агульнага працэсу развіцця грамадства; вызначэнне стану грамадства; абстрактнае выяўленне асаблівасцей спосабу існавання або ладу жыцця; абстрактнае абазначэнне форм і прадуктаў інтэлектуальнай дзейнасці.

Гістарычны погляд на культуру. Будова і функцыянаванне культуры ў кантэксце сацыяльных структур і інстытутаў. Філасофскі падыход да праблемы сутнасці, мэты і каштоўнасцей культуры. Рэлятывісцкія меркаванні прадстаўнікоў антрапалагічнага падыходу да сэнсу культуры.

## Тэма 4. Асноўныя тыпы вызначэння культуры

Аналітыка вызначэння культуры А.Крёбера і К.Клакхана (“Культура. Критический обзор концепций и дефиниций” і Л.Іоніна “Социология культуры”). Апісальнае вызначэнне ўсіх з’яў і працэсаў культуры. Гістарычныя ўяўленні сутнасці культурнага досведу і традыцый. Нарматыўныя вызначэнні ролі культурных каштоўнасцей і норм. Псіхалагічныя вызначэнні сутнасці культуры. Акцэнт на структуры культуры прыхільнікаў структурнага аналізу. Генетычныя вызначэнні культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 5. Асноўныя культуралагічныя школы і кірункі

Інтэгратыўны характар культуралагічных ведаў. Культуралагічныя веды ў межах сістэмы антрапалагічных навук (Э.Тайлар, Ф.Боас, М.Мід, Л.Уайт, Р.Бенедыкт і інш.). Гісторыка-філасофскія даследаванні культуры (І.Кант, Ф.Гегель, О.Шпенглер, А.Тойнбі, К.Ясперс, Н.Данілеўскі і інш.). Культурна-гістарычная школа і французская школа "Аналаў" (В.Дзільцей, Л.Февр, М.Блок і інш.). Сацыялагічная школа (П.Сарокін, Т.Парсанс, М.Вэбер, А.Вэбер). Структурна-сімвалічны кірунак і яго аспекты (Ф.дэ Сасюр, Э.Касірэр, К.Леві-Строс, Р.Барт, Ж.Лакан, Ю.Лотман і інш.).

## Тэма 6. Разнастайнасць падыходаў, кірункаў і школ у разуменні культуры

Каштоўнасныя і пазітывісцкія падыходы да культуры. Ідэі крэацыянізму, катастрафізму і эвалюцыянізму. Ідэі эвалюцыянізму і дыфузіянізму як аналітычны інструмент вывучэння культуры. Сімвалічны інтэракцыянізм. Марксісцкая канцэпцыя культуры. Цывілізацыйная школа як вывучэнне культурных макрасупольнасцей. Псіхааналітычныя канцэпцыі культуры.

Франкфурцкая школа ў культуралогіі. Крытыка прагрэсісцкай лініі развіцця культуры. Амерыканская антрапалагічная школа. Культурна-гістарычная школа. Гульнёвая мадэль культуры. Постструктуралісцкая і постмадэрнісцкая версіі развіцця культуры.

## Тэма 7. Семіятычныя і герменеўтычныя канцэпцыі культуры

Семіётыка культуры як навука аб знакавым характары культуры. Семіётыка і структуралізм. Р.Барт аб мэтах семіятычнага даследавання. "Смерць аўтара" і галоўная роля тэксту. "Гіпотэза лінгвістычнай адноснасці" Э.Сэпіра і Б.Л.Уорфа. Пабудова культуры па мадэлі мовы. Моўныя патэрны як стэрэатыпы культуры. Герменеўтыка і "разуменне" культуры. Культура як тэкст. Г.Г.Гадамер "Ісціна і метад". Разуменне і інтэрпрэтацыя. Дыялагічнасць тэксту і раўнапраўе інтэрпрэтацый. "Герменеўтычнае кола". Фенаменалагічная герменеўтыка П.Рікёра. Рэгрэсіўна-прагрэсіўны метад. Моўны характар чалавека як суб'екта культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 8. Псіхалагічныя тэорыі культуры

Псіхааналітычныя канцэпцыі культуры: свядомая і несвядомая матывацыя паводзін чалавека і соцыуму. Уплыў ідэй З.Фрэйда і К.-Г.Юнга на культуралогію ХХ ст.

Неафрэйдызм. Культуралагічная канцэпцыя Э.Фрома. Разрыў чалавека з прыродай і набыццё культурнай ідэнтычнасці. Модусы асобы – "мець" і "быць". К.Хорні: культура як фактар неўрозаў. Тыпы ўнутраных канфліктаў заходняй цывілізацыі. "Пазітыўны" псіхааналіз А.Маслоу. Паняцце самаактуалізацыі. Прагрэсіўныя і рэгрэсіўныя каштоўнасныя арыентацыі. Пікавае перажыванне і творчасць. "Лагатэрапія" В.Франкла. Сэнс – універсальная матывацыя асобы. Тыпы культурных каштоўнасцей.

## Тэма 9. Экзістэнцыяльныя канцэпцыі культуры

Жыццё як цэнтральнае паняцце экзістэнцыяльнай рэфлексіі. Асноўныя экзістэнцыялії: быццё, свабода, трывога, ніштоі інш. Тыпы экзістэнцыяльнай культуралогіі – рэлігійны і атэістычны: рознае і супольнае ў іх.

Рэлігійны экзістэнцыялізм. Абяцанне як аснова культурнага дзеяння. Экзістэнцыяльная камунікацыя К.Ясперса. Узроўні чалавечага быцця. Этапы гісторыі і канцэпцыя "восевага часу". Планетарная камунікацыя і сусветная культура.

Экзістэнцыялізм М.Хайдэгера. "Быццё-ў-магчымасці" і праблема мастацтва.

Атэістычны экзістэнцыялізм. Ж.-П.Сартр: канцэпцыя аўтарства. Свабода выбару і адказнасць чалавека. "Экзістэнцыялізм – гэта гуманізм". "Быццё пад позіркам Іншага". Пагранічная сітуацыя. А.Камю: "абсурд" і выбар асабістай пазіцыі. Гісторыка-культурныя формы бунту.

## Тэма 10. Персаналісцкія і дыялагічныя канцэпцыі культуры

Персаналісцкая канцэпцыя культуры Х.Артэгі-і-Гасета ("Паўстанне мас", "Дэгуманізацыя мастацтва"). Перспектывізм, рацыёвіталізм, "новая эстэтыка". "Чалавек-маса" ў ХХ ст. Крытыка масавай культуры. "Новае мастацтва".

Дыялагічная культурфіласофія М.Бубера ("Я і Ты", "Дыялог"). Культурныя ўстанаўленні "Я–Ты", "Я–Яно". Дыялог як эмпатычныя адносіны. Дыялог з людзьмі і з Богам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– межы перакрыжаванняў. Канцэпцыя аўтэнтычных стасункаў паміж асобамі і культурамі Э.Левінаса. Дыялог як сродак стварэння культурных сэнсаў. Каштоўнасць Іншага. Прынцып “асіметрыі дыялагічнай прасторы”.

## Тэма 11. Сімвалічны і інтуітыўны характар асобы і культуры

Антрапалагічныя канцэпцыі генезісу культуры і чалавека.

Інтуітывізм А.Бергсана. Інтэлект і інтуіцыя ў культуры. Культура і творчая эвалюцыя. “Дзве крыніцы маралі і рэлігіі”: закрытая і адкрытая мараль і рэлігія.

Сімвалічная канцэпцыя Э.Касірэра. “Філасофія сімвалічных формаў”: мова, міф, рэлігія і навука як формы пазнання. Функцыя сімвалізацыі як аснова культуры. Чалавек як animal simbolicum. Сімвал і міф. Палітычны міф.

Антрапалагічныя канцэпцыі М.Шэлера і А.Гелена. М.Шэлер “Стан чалавека ў Космасе”. Чалавек і жывёла: межы адрознення. “Светаўспрыманне” – якасць асобы. Формы самабыцця прыроды і культуры. А.Гелен (“Аб сістэматыцы антрапалогіі”): чалавек – істота, якая вызначаецца недахопамі. Гісторыя, культура і інстытуцыі як сродкі чалавечай адаптацыі. Функцыі мовы ў культуры.

## Тэма 12. Парадыгмальныя ўстаноўкі постмадэрнізму на сутнасць культуры

Постмадэрнізм як феномен культуры ХХ ст. Вытокі постмадэрнізму, яго асноўныя версіі. Структуралізм і постструктуралізм; мадэрнізм і постмадэрнізм. Прынцыпы постмадэрнізму (адмаўленне ад “заканадаўчага розуму” і “лагацэнтрызму”, “смерць аўтара”, панаванне тэксту, разбурэнне структуры знака, цытатнасць, інтэрпрэтацыя і плюралізм і інш. Асноўныя канцэпты постмадэрнізму: дыскурс, эпістэма, дэканструкцыя, рызома, сімулякр і інш.

Тэарэтыкі постмадэрнізму аб культуры. М.Фуко. Дыскурс і эпістэма; бессвядомы характар эпістэмы. Культурныя эпохі і іх эпістэмы. Моўнае мысленне і ўладарныя стратэгіі. Праблематычнасць чалавека. Ж.Дэрыда: свет як тэкст. Дэканструкцыя. Кантэкст і “след”. Ж.Бадрыяр пра сімулякры. Сімулятыўнасць у культуры. Ж.Дэлёз і Ф.Гватары (“Рызома”). Прынцыпы рызомы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 13. Напрамкі сучаснай замежнай культуралогіі: тэндэнцыі, перспектывы, вынікі

Сучасная замежная культуралогія: разнастайнасць, полістылізм, інтэрпрэтатыўнасць. Стварэнне культуралагічных мадэлей будучыні: выпрацоўка шляхоў быцця асобы і грамадства ў сучасным свеце. Міждысцыплінарны характар сучаснай культуралогіі, экзістэнцыяльна-антрапалагічная скіраванасць. Стратэгіі “разумення” народаў і культур. Персаналізм і культура асобы. Cultural studies і сучасныя напрамкі культуралогіі. Замежная культуралогія аб шляхах і механізмах пераадольвання крызісу культуры і стварэння “новага гуманізму”.

## Тэма 14. Праблемы культурнай прагностыкі ў культуралогіі

Футуралогія як навука прагназавання будучыні чалавецтва і культуры. Стратэгіі футуралогіі: алармісцкая і прагрэсісцкая. Мадэліраванне альтэрнатыў культуры будучыні. Э.Тофлер (“Футурашок”). Параметры сучаснасці. Паняцце футурашоку. Свабода выбару як крыніца нестабільнасці. Магчымыя змены культуры будучыні. Стратэгіі выхавання чалавека, здольнага да прыняцця змен. Ф.Фукуяма (“Канец гісторыі і апошні чалавек”). Распаўсюджанне ідэалаў Захаду. Дэградацыя самазадаволенага чалавека. С.Ф.Хантынгтон (“Сутыкненне цывілізацый”). Цывілізацыйны падыход да будучыні. Роля рэлігійных каштоўнасцей у цывілізацыях. “Цывілізацыйная ідэнтычнасць” і роля мяжы. Нацыярэнесанс. Эрозія культуры. Шляхі да талерантнасці. У.Бек аб “грамадствах рызыкі”.

Прагностыка развіцця культуры Беларусі. Спецыфіка беларускай мадэлі сацыякультурнага развіцця. Перспектывы развіцця навукі і адукацыі. Узаемадзеянні традыцый і навацый у культуры. Устойлівае развіццё Рэспублікі Беларусь ва ўмовах узаемадзеяння цывілізацый Усходу і Захаду. Ажыццяўленне прынцыпу “шматвектарнасці” знешняй палітыкі. Цывілізацыйная роля Беларусі ў працэсе фарміравання адзінай агульнаеўрапейскай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 15. Марфалогія культуры

Культурная форма як асноўная марфалагічная адзінка культуры. Семантычны і сацыяльны патэнцыял культурнай формы. Семантычныя культурныя формы: каштоўнасці, нормы, ідэі, сімвал. Формы культурнай дзейнасці: звычай, абрад, рытуал.

Культура як адбітак структуры яе суб’екта. Структурныя ўзроўні суб’екта культуры: біялагічны, сацыяльны. Асноўныя структурныя ўзроўні культуры: духоўны, мастацкі, матэрыяльны. Унутрана асобасны від культуры. Знешне-прадметны від культуры. Формы культуры: духоўная, матэрыяльная. Мастацкая культура як сярэдзінны пласт культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 16. Духоўная культура і яе сутнасць

Сутнасць духоўнасці. Разнастайнасць духоўнага жыцця чалавека. Духоўна-сімвалічны характар культуры. Вызначэнне паняцця “духоўная культура”. Міфалогія, рэлігія, мастацтва, навука (філасофія) як асноўныя формы духоўнай культуры. Прыярытэты духоўнай культуры. Функцыі духоўнай культуры: інфармацыйная, ментальная, знакава-сімвалічная, эстэтычная і інш.

Мараль – неад’емная частка культуры. Мараль як сукупнасць правілаў і норм паводзін у грамадстве. Функцыі маралі. Асобасная і сацыяльная мараль як антытэза. Маральная ацэнка паасобных з’яў грамадскага жыцця, учынкаў і матываў дзейнасці суб’ектаў культуры.

## Тэма 17. Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест

Матэрыяльная культура – аснова духоўнай. Умоўны падзел культуры на матэрыяльную і духоўную. Крытэрыі і прыметы матэрыяльнай культуры. Катэгорыі матэрыяльнай культуры: пароды жывёл, гатункі раслін, культура глебы, будынкі і збудаванні, шляхі зносін і транспартныя сродкі, інструменты, прыстасаванні, абсталяванне, сувязь і сродкі сувязі, тэхналогія.

Фундаментальныя структурныя пераўтварэнні відаў матэрыяльнай культуры ў XX– пачатку XXI ст.

## Тэма 18. Мастацтва як галіна культуры

Эстэтыка мастацтва. Катэгорыі эстэтыкі: прыгожае, брыдкае, узвышанае, трагічнае, камічнае і інш. Асноўныя рысы

мастацтва. Функцыі мастацтва: эстэтычная, пазнавальная, камунікатыўная, інфармацыйная, сугестыўная і інш.

Сістэмы класіфікацыі мастацтва: віды і разнастайнасць, роды і жанры. Сінтэтычнае мастацтва. Часавае, прасторавае, часава-прасторавае мастацтва.

Літаратура і яе асноўныя роды: эпас, лірыка, драма. Выяўленчае мастацтва і яго віды: жывапіс, графіка, скульптура. Архітэктура і яе стылі. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Музыка і яе ўласцівасці. Эстэтычныя асаблівасці тэатра. Харэаграфія як від сінтэтычнага мастацтва. Мастацка-эстэтычныя магчымасці кіно. Экранныя віды сучаснага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 19. Поліфункцыянальнасць культуры

Вызначэнне зместу паняцця “функцыя”. Класіфікацыя функцый. Тэорыя функцый у працах Э.Касірэра. Дыялектыка функцыянальнасці і дысфункцыянальнасці. Функцыя вытворчасці новых нормаў, каштоўнасцей, значэнняў і ведаў. Адаптыўная функцыя. Камунікатыўная функцыя. Канцэпцыя Х.М.Маклюэна аб ролі камунікатыўных тэхналогій у гісторыі культуры. Тыпы камунікацыі: традыцыйная, функцыянальна-ролевая, масавая. Гульнёвая функцыя культуры. Разуменне гульні ў працах І.Канта, Ф.Шылера, Й.Хёйзінга. Асаблівасці гульні.

Ідэалагічная функцыя. Ідэалогія як кампанент свядомасці суб’ектаў культуры.

Інфармацыйная функцыя. Узроўні інфармацыйных патрэбнасцей суб’ектаў культуры: біялагічны, сацыяльны. Віды інфармацыі. Станаўленне інфармацыйнага грамадства.

Сацыялізуючая функцыя культуры. Нормы і значэнні як сродкі сацыялізацыі індывіда. Статуснае засваенне культуры ва ўмовах масавай вытворчасці.

Інтэгратыўная функцыя. Распрацоўка тэорыі інтэграцыі прадстаўнікамі функцыянальнай антрапалогіі (Б.К.Маліноўскі, А.Р.Радкліф-Браўн і інш.). Супярэчлівы характар інтэгратыўнай функцыі культуры.

Кампенсатарная функцыя. Формы духоўнай і псіхалагічнай разрадкі і адпачынку ад праблем тэхнагеннага свету.

## Тэма 20. Культура сацыяльных супольнасцей

Характэрныя рысы элітарнай і народнай культуры.

Эліта як вышэйшы слой сацыяльнай структуры грамадства. Ідэя элітарнасці культуры ў працах М.А.Бярдзяева. Агульныя рысы, асаблівыя якасці і каштоўнасна-псіхалагічныя ўстаноўкі эліты. Нефармальная ўлада эліты.

Характэрныя рысы элітарнай культуры. Карпаратыўны характар элітарнай культуры. Духоўны арыстакратызм. Эстэтычная свабода. Глыбіня зместу і арыгінальнасць. Вытанчанасць формы. Наватарства. Індывідуальны пачатак і камерцыйная незалежнасць.

Народная культура як гістарычная аснова прафесійнай культуры. Роля народнай культуры ў ідэнтыфікацыі і самазахаванні этнасу. Этнас як суб'ект народнай культуры. Індывідуальныя, групавыя, масавыя элементы народнай культуры. Функцыі народнай культуры: эстэтычная, выхаваўчая, утылітарна-практычная, абрадавая і інш.

Ананімны, калектыўны, непрафесійны характар народнай культуры. Віды і формы народнай культуры. Творчыя стасункі і ўзаемадачыненні народнай і элітарнай культур.

## Тэма 21. Спецыфіка масавай культуры

Ірацыянальнасць масавых рухаў і масавай свядомасці.

Уплыў НТР, урбанізацыі, разбурэння лакальных супольнасцей і сацыяльных межаў на фарміраванне масавай культуры. Масавая культура як прадукт постіндустрыяльнага тыпу тэхналагічнага развіцця. Месца сучасных сродкаў камунікацыі і павышэння ўзроўню адукаванасці мас у дынаміцы масавай культуры. Дэмакратызацыя грамадства як каталізатар масавай культуры. Наркатычны характар масавай культуры. Прымітывізацыя чалавечых адносін, прыярытэт у маскульце грошай, поспеху, прапаганда канфармізму, жорсткасці, насілля, сексу. Натуралізм як рыса масавай культуры. Сэнсавы дыяпазон масавай культуры. Асноўныя жанры масавай культуры.

## Тэма 22. Субкультура і контркультура, іх суадносіны

Паняцце “субкультура” і яе сутнасць. Асноўныя рысы субкультуры і фактары іх фарміравання. Тыпалогія субкультур. Сацыяльныя функцыі субкультуры. Прычыны актуалізацыі субкультурных утварэнняў у трансфармаваным беларускім грамадстве. Субкультурны выбух сучаснасці (А.Тофлер).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Субкультуры моладзі XX – пачатку XXI ст. (хіпі, бітнікі, панкі, готы, скінхеды, хакеры, рокеры, тынейджары, байкеры і інш.).

Паняцце “контркультура”. Месца і роля контркультуры ў гістарычнай дынаміцы. Важнейшыя характарыстыкі контркультуры. Спецыфіка ўзаемасувязі культуры, субкультуры і контркультуры ў гісторыі.

## Тэма 23. Культура паўсядзённасці

Феномен паўсядзённасці. Паўсядзённасць як прадукт сацыякультурнага канструявання. Паўсядзённасць і “жыццёвы свет”. Кампаненты і якасці жыццёвага свету.

Паўсядзённасць і міф. Сучасны міф. Нацыянальныя міфалогіі. Міфы масавай культуры.

Паўсядзённасць і ментальнасць. Культурныя канстанты як структураўтваральныя кампаненты ментальнасці ў паўсядзённасці. Ментальнасць і менталітэт.

Хранатоп паўсядзённасці. Прастора паўсядзённасці. Час паўсядзённасці.

## Тэма 24. Тыпалагічны аналіз культуры

Крытэрыі і прынцыпы тыпалагізацыі культур. Колькасна-зместавая характарыстыка канкрэтна-гістарычных формаў бытавання культуры. Праблема тыпалогіі ў фундаментальнай культуралогіі (М.А.Бярдзяеў, Ф.Ніцшэ і інш.).

Крытэрыі класіфікацыі культур: прасторава-геаграфічны, сацыяльны, фармацыйны, храналагічна-часавы, этнаграфічны і інш.

Прынцыпы тыпалагізацыі культур: рэгіянальна-тэрытарыяльны, дэмаграфічны, канцэптуальны, культурна-гістарычны, рэлігійны, этнанацыянальны, цывілізацыйны і інш.

Канкрэтна-гістарычныя тыпы культуры: прыродна-сімвалічны, рацыянальна-нарматыўны, антрапалагічны, пратэстанцка-рэфармісцкі, крытыка-асветніцкі, рамантычна-ўтапічны, індывідуальна-прагматычны, дэмакратычна-тэхнатронны, таталітарна-бюракратычны і інш.

## Тэма 25. Важнейшыя тыпалагічныя мадэлі культуры

Адзінства ўнутранага, псіхалагічнага ладу калектыўнай душы народа – аснова тыпалагічнай мадэлі О.Шпенглера. Прасімвал культуры. Тыпы культуры паводле О.Шпенглера.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Класіфікацыя культур М.Я. Данілеўскім. Дзейнасная прырода культуры. Славянскі культурна-гістарычны тып культуры і яго патэнцыял.

Культурна-гістарычная канцэпцыя К.Ясперса. Сутнасць паняцця "восевы час". Праметэеўскі тып культуры. Гуманістычная культура восевага часу.

Канцэпцыя цыклічнага развіцця культуры П.А.Сарокіна. Ідэацыйны, сенсетыўны і ідэалістычны тыпы культуры. М.Мід аб асаблівасцях узаемадзеянняў пакаленняў.

"Драўняная", "культура і культура", "рызомы" (Ж. Дэлёз, Ф.Гватары). Характарыстыка традыцыяналісцкага і тэхнагеннага тыпаў культуры.

## Тэма 26. Антыномія прыроднага і культурнага

Свет прыроды і свет культуры. "Натура" і "культура": іх узаемадзеянні. Антыномія прыроднага і культурнага. Дэмакрыт аб культуры як другой прыродзе. Разуменне прыроднага і культурнага ў еўрапейскай культурфіласофскай думцы. Ідэя канфрантацыі і ідэя коэвалюцыі.

Чалавек як біясацыяльная істота. Роля прыроды ў станаўленні і развіцці культуры. Прыродныя сімвалы ў культуры. Фарміраванне актывісцкай парадыгмы. Ідэя пазнання прыроды і культуры (Ч.Дарвін, А. Басціян, Э.Тайлар, Л.Морган, Л.Уайт і інш.). Узнікненне экалогіі як навукі.

Тэорыя коэвалюцыі чалавека, грамадства і культуры (А.Кробер, М.Маісееў). Ідэя "ўстойлівага развіцця" прыроды, культуры і асобы. Глабальныя праблемы сучаснай цывілізацыі і шляхі іх вырашэння (недахоп прыродных рэсурсаў, скарачэнне біялагічнай разнастайнасці, забруджванне паветра, планетарнае пацяпленне і інш.).

## Тэма 27. Асоба і культуры

Паняцце, структура і сутнасць асобы. Структура асобы. Структурная антрапалогія К. Леві-Строса. Узроўні асобаснай інтэграцыі: сацыяльна-ролевы, характаралагічны, экзістэнцыяльны. Асноўныя экзістэнцыяльныя каштоўнасці і структуры (Ж.-П.Сартр, П.Тыліх, В.Франкл, К.Ясперс і інш.). Тэзіс культурнага рэлятывізму Ф.Бааса. Канцэпцыі "асноўнай асобаснай структуры" і "мадальнай асобы". Р.Бенедыкт: "этас" і "патэрны" культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важнейшыя канцэпцыі чалавека: антычны, космацэнтрычны, тэацэнтрычны, гуманістычны і інш. Чалавек у разуменні культурфілосафаў эпох мадэрну і постмадэрну.

Спецыфіка дзейнасці чалавека. Творчасць як асноўны тып асобаснай дзейнасці. Спосабы і формы засваення культуры асобай.

### Тэма 28. Сацыялізацыя асобы сродкамі культуры

Інтэрыярызацыя і яе стадыі. Хамінізацыя – першы этап уваходжання чалавека ў культурную прастору. М.Херсковіц аб спантанным характары хамінізацыі.

Фарміраванне асобы ў працэсе сацыялізацыі. Т.Парсанс аб інтэграцыі індывіда ў сацыякультурную сістэму. Адукацыя і выхаванне як састаўныя часткі сацыялізацыі. М.Мід: сацыялізацыя дзяцей, сацыяльныя ролі, сям'я і шлюб ("Сталенне на Самоа"). Тыпалогія культур М.Мід. Параўнальны аналіз нацыянальных характараў.

### Тэма 29. Інкультурацыя і яе псіхалагічныя механізмы

Паняцце "інкультурацыя". М.Мід, Д.Матсумота, М.Херсковіц аб сутнасці інкультурацыі. Спосабы перадачы культурнай інфармацыі: вертыкальная, гарызантальная і непрамая трансмісіі. Пазітыўныя і негатыўныя псіхалагічныя механізмы інкультурацыі (віна, сорам, імітацыя, ідэнтыфікацыя). Агенты і інстытуты інкультурацыі.

### Тэма 30. Акультурацыя ў міжкультурнай камунікацыі: сутнасць, стратэгія, вынік

Акультурацыя як змена каштоўнаснай арыентацыі, ролевых паводзін, сацыяльных установак індывіда (Р.Рэдфільд, Р.Лінтан, М.Херсковіц). Асобасны характар акультурацыі. Праблемы акультурацыі: захаванне сваёй культурнай ідэнтычнасці і ўключэнне ў чужую культуру.

Асноўныя стратэгіі акультурацыі: асіміляцыя, сепарацыя, маргіналізацыя, інтэграцыя. Акультурацыя як камунікатыўны працэс.

### Тэма 31. Міжкультурная камунікацыя

Сутнасць, мэты і задачы міжкультурнай камунікацыі. Міжкультурная кампетэнцыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сутнасныя культурныя адрозненні паміж людзьмі. Змест паведамленняў і іх уплыў на ўзаемаадносіны. Двухсэнсоўнасць і невыразнасць камунікацый і шляхі іх пераадолення. Спосабы разумення паводзін суразмоўцы, выяўленне матывацыі яго ўчынкаў.

Сістэмы камунікацый у розных культурах і шляхі іх засваення падчас інкультурацыі. "Міжкультурная кампетэнцыя" і яе сутнасць. Аспекты міжкультурнай кампетэнцыі. Элементы міжкультурнай камунікацыі: *афектыўныя* (эмпатыя і талерантнасць), *кагнітыўныя* (культурна-спецыфічныя веды, неабходныя для адэкватнага разумення камунікатыўных паводзін прадстаўнікоў іншай культуры), *працэсуальныя* (стратэгіі, якія ўжываюцца ў сітуацыях міжкультурных кантактаў і накіраваны на паспяховае праходжанне камунікатыўнага ўзаемадзеяння).

Мэты авалодання міжкультурнай кампетэнцыяй: кіраванне працэсам узаемадзеяння, адэкватная інтэрпрэтацыя яго, набыццё новых культурных ведаў з кантэксту пэўнага міжкультурнага ўзаемадзеяння.

Стратэгіі дасягнення міжкультурнай камунікацыі. Асноўныя віды міжкультурнай камунікацыі: вербальная, паравербальная і невербальная.

**Тэма 32. Дынаміка культурна-гістарычнага працэсу**

Разнастайнасць формаў і механізмаў культурных змяненняў.

Паняцце "культурная дынаміка" і дэтэрмінанты культурных змяненняў, мадыфікацыя рыс культуры ў прасторы і часе. Флуктацыя культуры (П.Сарокін "Сацыяльная і культурная дынаміка"). Інфармацыйная тэорыя адаптацыі Т.Парсанса.

Асноўныя канцэпцыі культурнай дынамікі: працоўная тэорыя марксізму, сінергетычная парадыгма "сістэмнага эфекту", тэорыя канфлікту, псіхааналітычны падыход да культурнай зменлівасці і інш. Лінейна-паступальныя, хвалепадобныя, цыклічныя, інверсійныя, выбуховыя змяненні (Ю.М.Лотман "Культура і выбух").

Дынаміка ўнутраных працэсаў, іх узаемадзеянне з культурнай падзеяй. Важнейшыя культурныя працэсы: параджэнне культурных феноменаў; іх міжпакаленная трансляцыя і прастора культурнага свету; іх зменлівасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Традыцыя як крыніца культурнай дынамікі. Грамадскі характар традыцыі. Агульнаславянскія вытокі беларускіх культурных традыцый.

Культурная інавацыя і шляхі яе ўзнікнення. Культурныя мутацыі. Этапы ўкаранення культурнай інавацыі: адбор, мадыфікацыя, інтэграцыя. Узаемадзеянне традыцый і навацый.

Запазычанні як від культурнай дынамікі. Псіхасацыяльныя фактары прыняцця і адмаўлення культурных запазычанняў.

Культурная дыфузія і яе напрамкі. Аналіз часавых, прасторавых характарыстык культур Ф.Грэбнерам, Ф.Ратцэлем, Л.Фрабеніусам, К.Уіслерам. Механізмы культурных дыфузій. Гарызантальная і вертыкальная дыфузія.

### Тэма 33. Цывілізацыя і яе ўзаемаадносіны з культурай

Сутнасць цывілізацыі і яе ўзаемаадносіны з культурай. Разнастайнасць тэарэтычных падыходаў да сутнасці цывілізацыі. Цывілізацыя і варварства. Цывілізацыя як грамадства роўнасці і справядлівасці. Разуменне цывілізацыі як універсальнага, няўхільнага, паступальнага руху. Цывілізацыя як матэрыяльная аснова культуры. Цывілізацыя як сістэма сацыякультурных структур, інстытутаў і прадуктаў чалавечай працы. Характар цывілізацыі: прагматычны, “плебейскі”. Сферы цывілізацыі: матэрыяльнае багацце, вытворчасць, тэхніка, дабрабыт і камфорт, сістэма дзяржавы і права. Узаемадзеянне і ўзаемаўплыў культуры і цывілізацыі. Духоўнасімвалічны характар культуры. М.А.Бярдзяеў аб паходжанні культуры.

Стадыі і тыпы цывілізацый. Аграрна-традыцыйная цывілізацыя і яе характарыстыка. Індустрыяльная, або тэхнагенная, цывілізацыя і яе мэты. Постіндустрыяльная цывілізацыя і яе адметнасці. Фарміраванне глабальнай цывілізацыі і яе негатыўныя і пазітыўныя наступствы. А.Тофлер, Ф.Фукуяма, С.Ф. Хантынгтон аб сцэнарыях развіцця цывілізацый.

Цывілізацыі Захаду і Усходу і іх узаемадачыненні.

### Тэма 34. Культурагенез і яго асноўныя фактары

Навуковыя падыходы і кірункі даследавання антрапасацыягенезу і генезісу культуры. Фарміраванне культуры як універсальнага механізму самаарганізацыі і грамадскага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станаўленне першабытнай культуры. Архаічны (даміфалагічны) светапогляд. Татэмізм як адна з найбольш старажытных формаў вераванняў (эпохі палеаліту). Анімізм, фетышызм як тып светаадчування дагістарычнай эпохі. Міфалогія і яе значэнне. Рытуал і яго функцыі ў першабытным грамадстве. Узнікненне пахавальных абрадаў і культ продкаў. Дасягненні неалітычнай рэвалюцыі. Курганна-мегалітычная культура V–I тыс. да н.э. у Еўразіі.

Вобраз свету першабытнага чалавека (час, прастора, самаадчуванне). Асноўныя рысы першабытнай культуры. Фарміраванне традыцыі як сродку акумуляцыі і трансмісіі жыццёвага вопыту.

Першабытнае мастацтва. Пячорнае і наскальнае выяўленчае мастацтва (Альтаміра, Ляско, Мантэспан, Тасілі, Чатал-Гуюк і інш.). Помнікі першабытнай культуры на тэрыторыі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 35. Культуры Старажытнага Усходу

Культурна-гістарычныя арэалы Усходу: Старажытная Месапатамія, Старажытны Егіпет. Характэрныя рысы старажытных цывілізацый: адаптацыя да прыроды, патрыярхальнасць, іерархічнасць, аўтарытарнасць, статычнасць, інтраверсія, абстрактнасць мыслення. Спецыфіка разумення асобы на Усходзе.

Перыядызацыя культуры Старажытнай Месапатаміі. Містыцызм і “магічная душа” ў культуры Месапатаміі (О.Шпенглер, М.Эліадэ). Культ лёсу. Развіццё рэлігійных уяўленняў. Пантэон багоў.

*Шумерская цывілізацыя.* Міфалогія шумераў. Узнікненне і развіццё пісьменнасці. Асноўныя дасягненні ў навуцы і тэхналогіях. Архітэктура шумераў (зікураты). Зараджэнне пісьменнай і прававой думкі ў Месапатаміі.

*Вавілонскае царства.* Дасягненні ў будаўніцтве дзяржавы, права. Літаратурныя творы. Развіццё навукі. Вавілон – шэдэўр горадабудаўніцтва. Вавілонская башня. “Эпас пра Гільгамеша” як літаратурны помнік старажытнасці.

Вісячыя сады Семіраміды. “Законы Хамурапі” – старажытны помнік прававой думкі. “Ідэя таліёна”.

### Тэма 36. Культура Старажытнага Егіпта

Адметныя асаблівасці старажытнаегіпецкай цывілізацыі. Старажытнаегіпецкая культура як вынік прыстасавання да

прыродна-кліматычных умоў (А.Д.Тойнбі). Піраміда як прасімвал егіпецкай культуры. Культ памерлых. Пахавальня Тутанхамона – дасягненні ў дэкаратыўным мастацтве. Роспісы пахавальняў. Час як важнейшая катэгорыя свядомасці егіпцян. Рэлігійная рэформа фараона Эхнатона. Мастацтва эпохі Эхнатона. Асноўныя выяўленчыя каноны. Шэдэўры скульптуры. Літаратура Старажытнага Егіпта. Храмы і скульптуры эпохі Рамсесаў: Луксор, Карнак.

*Егіпет эпохі элінізму*. Характарыстыка эпохі. Александрыя як культурны цэнтр. Александрыйская філалагічная школа. Александрыйскі маяк – адно з цудаў свету.

Рымскі перыяд у развіцці культуры Егіпта.

Развіццё навуковых ведаў (матэматыка, астраномія, медыцына, ваенная справа і інш.).

**Тэма 37. Спецыфічныя адметнасці кітайскай культуры**

Перыядызацыя старажытнакітайскай культуры.

*Перыяд архаікі*. Культура першых дзяржаў. Эпоха Чжоў – “сто школ” у філасофіі Кітая.

*Перыяд класікі*. Утварэнне імперыі Цынь. Імперыя Хань – залаты век імперыі.

*Эпоха шасці дынастый*. Рост уплыву будызму на развіццё кітайскай культуры.

Традыцыяналізм кітайскай культуры. Канцэпцыя сярэдзіннай дзяржавы. Культ імператара і продкаў. Сямейна-этнічныя адносіны.

Асноўныя філасофска-рэлігійныя вучэнні Старажытнага Кітая: даасізм, канфуцыянства, маізм. Паняцці “дао”, “Інь” і “Янь” як аснова гармоніі свету. Даоская тэхніка самаўдасканалення. Канфуцыянская мараль і мадэль ідэальнага чалавека. Прынцып гармоніі ў канфуцыянстве. Будыйская маральная традыцыя.

Рацыянальнасць мыслення як адметнасць кітайскага менталітэту. Навуковыя дасягненні. Стварэнне іерагліфічнай пісьменнасці. Кітайскі каляндар. Дасягненні кітайскай медыцыны. Мастацтва Старажытнага Кітая (літаратура, выяўленчае мастацтва, дойлідства, музыка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва). Звычаі і абрады. Сістэма адукацыі і выхавання.

**Тэма 38. Культура Старажытнай Індыі**

Гістарычныя тыпы індаарыйскай цывілізацыі. Протаіндыйская культура, індаарыйская культура, культура дынастыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маўр’ескага грамадства. Варна-каставая сістэма. Развіццё міфалагічных, рэлігійных, філасофскіх уяўленняў аб свеце. Вучэнне аб душы, карме і сансары. Брахмаізм, будызм, індуізм – асноўныя філасофска-рэлігійныя вучэнні. Аморфнасць індуізму. Рэлігійны плюралізм. Важнейшыя прынцыпы будызму. Паняцце нірваны. Махаяна і Хінаяна. Мастацкая культура Старажытнай Індыі. Веды – рэлігійна-філасофскі помнік. “Махабхарата” і “Рамаяна” – шэдэўры літаратуры сусветнага значэння. Значэнне танца ў індыйскай культуры. Пячорныя гарады і храмавыя комплексы. Прававая культура (Закон Ману). Развіццё навукі і тэхнікі (астраномія, матэматыка, медыцына і інш.). “Камасутра” – энцыклапедыя сямейных адносін і сексуальнага жыцця.

## Тэма 39. Культура араба-мусульманскага свету

*Асірыя*. Арганізацыя войска. Сталіца дзяржавы – горад Ніневія. Роспісы і барэльефы. Бібліятэка цара Ашурбаніпала. Асірыйскі этнас у гісторыі.

*Культура Старажытнага Ірана. Арыяна*. Авеста – найбольш старажытная свяшчэнная кніга чалавецтва. Асаблівасці рэлігіі зараастрызму.

*Культура Персіі імперскага перыяду*. Фарміраванне імперыі Кіра. Шэдэўр горадабудаўніцтва – сталіца Персіі горад Персепаль.

## Тэма 40. Культура Старажытнай Грэцыі як пачатак і парадыгма еўрапейскай культуры

Антычны тып культуры, яе адметнасці: антрапацэнтрызм, аганальнасць, антрапаморфнасць, касмалагізм, суразмернасць, політэізм, міфалагічнасць і інш. Асновы грэка-рымскай цывілізацыі (М.Я.Данілеўскі, О.Шпенглер, К.Т.Ясперс). Перыядызацыя старажытнагрэчаскай культуры.

*Крыта-мікенскі перыяд*. Рассяленне старажытных этнасаў у III–II тыс. да н.э. па Еўропе і Міжземнамор’і. Фарміраванне грэчаскай міфалогіі. Мінойская культура вострава Крыт. Сімволіка Лабірынта. Кноскі палац. Абшчынна-родавая культурная спадчына ў культуры Грэцыі. Уяўленні аб культурнай дынаміцы.

*Антычная Грэцыя перыяду архаікі*. Адраджэнне Грэцыі пасля “цёмных стагоддзяў”. Полісная сістэма дзяржаўнасці. Алімпійскія гульні. Міфалогія антычнай Грэцыі: пантэон,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўныя цыклы міфаў. Апалонаўскае і дыянісійскае ў культуры. Элінскі эпас. Грэчаская лірыка. Натурфілосафы эпохі архаікі. Праблема спалучэння рацыянальнасці і містыкі. Грэчаскі архітэктурны ордэр. Ідэя “парадку” і прынцып “меры”. Скульптура. Дэкаратыўнае мастацтва.

*Антычная Грэцыя перыяду класікі.* Палітычная культура старажытных грэкаў. Класічны перыяд у гісторыі філасофіі (Сакрат, Платон, Арыстоцель). Афіны – цэнтр адукацыі і культуры. Акадэмія Платона і ліцэй Арыстоцеля. Антычныя каляндарныя містэрыі і мастацтва драмы. Афінскі Акропаль – шэдэўр антычнай архітэктуры. Алімпія. Скульптары эпохі класікі. Сямейныя адносіны і быт грэкаў.

*Культура элінізму.* Сінтэз мастацтва Захаду і Усходу. Інтэнсіўнасць развіцця мастацтва. Асноўныя дасягненні эпохі. Цуды свету. Скульптура. Мастацтва як адлюстраванне змен у светаўспрыманні грэкаў. Карынфскі ордэр як сімвал эклектызму.

## Тэма 41. Культурная спадчына старажытнарымскай цывілізацыі

Перыядызацыя старажытнарымскай культуры: этрускі і царскі перыяды; перыяд рэспублікі; перыяд імперыі. Уплыў грэчаскай культуры на рымскую цывілізацыю. “Civitas” як падмурак рымскай культуры. Своеасаблівасць карціны свету ў Старажытным Рыме. Каштоўнасці рымскай супольнасці. Канцэпт лёсу (фатуму) у сістэме каштоўнасцей рымлян.

Міфалагізацыя гісторыі як характэрная рыса рымлян. Пантэон Рыма (Марс, Юнона, Юпітэр і інш.). Крызіс старажытнарымскай рэлігіі. Хрысціянства як сінтэз іўдзейскай і антычнай культурных традыцый.

Палітычная і прававая культура Рыма (Г.Ю.Цэзар, М.Т.Цыцэрон, Палібій і інш.). Рымская філасофская школа (Марк Аўрэлій, Луцый Сенека і інш.). Стаіцызм. Рыторыка як адлюстраванне ментальнай асновы рымскай культуры. Тэатр і святы. Рымскі раман. Скульптурны партрэт. Уплыў культуры Рыма на станаўленне заходняй цывілізацыі. Навука і адукацыя. Рымскія гісторыкі. Асноўныя архітэктурныя формы, тыпы будынкаў. Рымскае дойлідства. Мастацкая спадчына Геркуланума. Інтымізацыя культуры (Катул, Авідзій, неатэрыкі). Раннехрысціянскае мастацтва і сімволіка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 42. Культура Візантыі і яе ўплыў на культуру ўсходніх славян

Хрысціянскі характар візантыйскай цывілізацыі. Станаўленне сярэдневяковага грамадства. З'яўленне і развіццё феадалізму. Культ імператарскай улады. Візантыйская культура – спадкаемца антычнай культуры. Сінтэз грэка-рымскай і ўсходняй культур. Прынцып "адна дзяржава – адна рэлігія". Хрысціянства як дзяржаўная рэлігія. Фарміраванне хрысціянскай царквы як асобай арганізацыі. Узнікненне мастацтва. Барацьба "іканаборцаў" і "іконапаклоннікаў". Ерэтычныя рухі: арыянства, монафізіцтва і інш.

Філасофска-тэалагічная думка ў Візантыі. Неаплатанізм (Прокл, Псеўда-Дыянісій Арэпагіт, Юліян Адступнік). Багаслоўскія ідэі Іаана Дамаскіна і Максіма Спаведніка. Містычная багаслоўская тэорыя Сімяона Багаслова. Уздым рацыяналістычнай думкі (Фоцій). Паварот да платанізму і неаплатанізму (Міхаіл Псел).

Мастацтва Візантыі. Культавая і свецкая музыка. Храм як сімвал свету. Сабор Святой Сафіі – галоўны храм Візантыі. Выяўленчае мастацтва: фрэскі, мазаікі, іконы. Літаратура (агіяграфія, духоўныя гімны). Літургічная драма (містэрыя). Адукацыя. Візантыйскі энцыклапедызм. Уплыў культуры Візантыі на славянскі свет. Культурныя стасункі Візантыі, Полацкага і Тураўскага княстваў. Хрышчэнне беларускіх зямель.

## Тэма 43. Еўрапейская культура эпохі Сярэднявечча

Паняцце Сярэднявечча і яго інтэрпрэтацыя ў еўрапейскай гуманітарнай думцы (Ф.Ніцшэ, Й.Хёйзінга, М.Блок, Ф.Бродэль, Ж.Ле Гоф і інш.). Перыядызацыя еўрапейскай сярэдневяковай культуры: ранняя, сталая, позняя. Хрысціянства як каштоўнасна-сімвалічная аснова культуры Сярэднявечча. Узнікненне хрысціянскай тыпалогіі культуры і яе роля ў станаўленні хрысціянскага тыпу культуры (Іаан Златавуст, св. Аўгусцін, Фама Аквінскі і інш.).

Адметнасць сярэдневяковай карціны свету. Храм як "вертыкаль духу"; горад як "гарызанталь гісторыі". Ідэя ўсеагульнай любові. Боскае адкрыццё як аснова пазнання свету. Ідэя асабістага выратавання веруючага. Хрысціянская сатэрыялогія – вучэнне аб выратаванні. Дуалізм сярэдневяковай свядомасці: горні свет і дольны свет.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Субкультуры Сярэднявечча: хрысціянская, рыцарская, бюргерская, вясковая, варварская. Узаемасувязь рэлігійнай, арыстакратычнай і народнай культуры.

Мастацкая сярэдневяковая культура. Раманскі і гатычны стылі і іх адметныя рысы. Хрысціянскі канон. Хрысціянская іканаграфія. Мазаікі і фрэскі. Кніжная мініяцюра. Помнікі архітэктуры: саборны ансамбль у Пізе, царква Нотр-Дам дзю Пор у Клермон-Феране, сабор Парыжскай Божай Маці і інш. Музычнае мастацтва: грыгарыянскі харал, поліфанія, чатырохлінейны нотны стан. Літаратура: эпас, літургічная драма, раман, куртуазная паэзія. Сярэдневяковы тэатр: містэрыя, фарс, міракль. Народная карнавальная культура як "іншае жыццё народа на аснове смеху". Станаўленне адукацыі. Узнікненне першых універсітэтаў.

Сярэдневяковая беларуская культура. Хрысціянскі гуманізм беларускіх асветнікаў: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўраамій Смаленскі. Школы дойлідства на беларускіх землях. Помнікі архітэктуры: Сафійскі сабор у Полацку, гродзенская царква Барыса і Глеба, царква Благавешчання ў Віцебску і інш. Манументальны і станковы жывапіс. Дробная пластыка. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Сістэма адукацыі і выхавання. Царкоўныя і манастырскія школы.

## Тэма 44. Культура эпох Адраджэння і Рэфармацыі

Сацыяльна-эканамічныя перадумовы ўзнікнення культуры Рэнесанса. Тыпы рэнесансных культур: італьянскае Адраджэнне, Паўночнае Адраджэнне, Няпоўнае Адраджэнне (Англія, Партугалія, Чэхія, Польшча). Протарэнесанс, Ранні Рэнесанс, Высокі Рэнесанс, Позні Рэнесанс. Змяненне тэацэнтрычнага светапогляду на гомацэнтрычны. Новая інтэрпрэтацыя традыцыйных хрысціянскіх догматаў. Засваенне антычнай культурнай спадчыны. Ідэалы і каштоўнасці рэнесансных гуманістаў. Ідэал гармоніі чалавека і космасу.

Мастацтва як увасабленне новай карціны свету. Італьянскія жывапісныя школы. Творчасць Леанарда да Вінчы, Б.Мікеланджэла, В.Тыцыяна, С.Батычэлі, С.Рафаэля, Альбрэхта Дзюрэра, Іераніма Босха і інш. Ман'ерызм як стыль Рэнесанса. Адлюстраванне ў тэатральным мастацтве гуманістычных ідэй і супярэчнасцей эпохі (У.Шэкспір). Адраджэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камедый, трагедый, пастаралей. La commedia erudite і камедыя дэль артэ.

Музычнае мастацтва: ars antigua, ars nova. Нідэрландская поліфанічная школа. Развіццё народнай песеннай творчасці і інструментальная музыка. Фларэнтыйская камерата.

Асаблівасці літаратуры Рэнесанса. “Кніга песень” Ф.Петраркі. Рэнесансная навела Д.Бакачыа, Л.Арыёста. Рэалістычна-фантастычныя раманы Ф.Рабле, М.Сервантэса.

Асноўныя дасягненні ў галіне навукі і іх уплыў на духоўную культуру. Светапоглядныя канцэпцыі С.Буднага, В.Цяпінскага, А.Волана і інш. Культуратворчая дзейнасць Ф.Скарыны. Станаўленне і развіццё беларускай мовы, пісьменнасці і літаратуры (М.Гусоўскі, Я.Вісліцкі).

Пашырэнне адукацыі. Брацкія школы. Езуіцкія калегіумы. “Граматыка” М.Сматрыцкага.

## Тэма 45. Культура Новага часу

Сацыяльна-палітычныя дэтэрміналты фарміравання культуры Новага часу.

Пераходны характар культуры – ад Сярэднявечча да Новага часу. Класіцызм. Барока як стыль эпохі. Навуковая рэвалюцыя. Культ навукі і тэхнікі. Секулярызацыя культуры і быту. Асвета як ідэалогія буржуазіі. Пратэстантызм і яго роля ў фарміраванні капіталістычных адносін (М.Вэбер).

Філасофія Новага часу. Асветніцкія ідэі Д.Дзідро, Фр.М.А.Вальтэра, Ж.-Ж.Русо і інш. Асноўныя мастацкія напрамкі. Культура ракако. Мастацтва Францыі, Англіі, Іспаніі, Германіі. Венская школа ў музыцы. Фламандская школа жывапісу.

Культура Захаду ў XIX ст.: агульная характарыстыка эпохі. Эпоха рамантызму. Ідэалы і сімвалы рамантызму ў мастацтве. Стагоддзе літаратуры, музыкі, тэатра. Стыль ампір. Новыя напрамкі ў архітэктуры. Містычны элемент рамантызму (У.Блэйк). Эскапісцкія ідэі рамантызму (Дж. Г.Байран і інш.). Цікавасць да культур Усходу і народнай культуры.

Беларуская культура XVII–XVIII стст. Грэка-каталіцкая царква і яе ўплыў на развіццё культуры. Асвета і адукацыя. Асветніцкая дзейнасць Сімяона Полацкага, М.Пачобута-Адляніцкага, Л.Залускага, Я.Даманеўскага, Б.Дабашэвіча і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 46. Еўрапейская культура XIX ст.

Пошукі рэалістычнага мастацтва ў XIX ст. Эстэтычныя ідэалы рэалізму. Адлюстраванне рэалій буржуазнай культуры. Імпрэсіянізм у культуры Еўропы.

Дэкаданс. Культурфіласофская рэфлексія Ф.Ніцшэ. Стыль мадэрн. Мадэрнізм – інавацыйна-крэатыўны тып культурнага светабачання. Авангардныя напрамкі ў культуры як адлюстраванне супярэчнасцей быцця Еўропы (кубізм, сімвалізм, сюррэалізм, футурызм, экспрэсіянізм і інш.).

Фарміраванне дэмакратычный ідэалогіі і грамадскай думкі ў XIX ст. (К.Каліноўскі, А.Незабытоўскі, Ф.Савіч і інш.).

Вобраз рамантычнага героя ў творчасці А.Міцкевіча. Эстэтыка рамантызму ў паэзіі Т.Зана і Я.Чачота. Тэндэнцыя ўпарадкавання існуючага, а не яго пераўтварэння ў драматургіі В.Дуніна-Марцінкевіча. Прынцыпы рэалізму і народнасці ў творах Ф.Багушэвіча. Рамантычныя і рэалістычныя пачаткі ў паэзіі Я.Лучыны.

## Тэма 47. Сацыядынаміка еўрапейскай культуры XX– пачатку XXI ст.

Крызіс каштоўнасцей розуму, прагрэсу і самабытнасці свету ў познім індустрыяльным грамадстве. Культура мадэрну як пошук новых духоўных асноў быцця. Сацыяльна-палітычныя рухі левард ыкальнага і праварадыкальнага зместу. Распад адзінства еўрапейскай культуры постіндустрыяльнага грамадства.

Масавае грамадства і культура. Тэхналагічныя і сацыяльныя дэтэрмінанты фарміравання масавай культуры. Механізм масавай культуры і яе функцый.

Феномен постмадэрнізму і яго адметныя ўласцівасці. Рост культурнай разнастайнасці. Узаемадзеянне культур, міжкультурная камунікацыя. Дыялог культур. Варыянты ўзаемадзеяння самабытнасці і сучаснасці.

Агульныя прынцыпы і каштоўнасці савецкай культуры. Уніфікацыя культурнага жыцця ў савецкім грамадстве. Дэструкцыя сацыялістычнай культуры. Сацыякультурнае фарміраванне постсавецкага грамадства.

Перадумовы фарміравання сусветнай культуры. Складванне планетарнай прасторы культуры. Праблема глабальных цэнтраў і перыферыі культуры. Полімарфізм культуры як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактар устойлівага развіцця сучаснага грамадства. Футуралогія аб глабальным мадэліраванні розных аспектаў сусветнай культуры.

## Тэма 48. Культура Расіі і яе ўплыў на беларускую культуру

Руская культура ў перыяд Кіеўскай Русі і старажытных княстваў (IX–XIII стст.). Дзяржаўны лад і матэрыяльная культура. Хрышчэнне Русі і фарміраванне хрысціянскага тыпу культуры.

Руская культура ў перыяд станаўлення цэнтралізаванай дзяржавы (XIV–XVII стст.). Архітэктура і выяўленчае мастацтва (Феафан Грэк, Андрэй Рублёў, Фёдар Конь і інш.). Развіццё старажытнарускай літаратуры.

Пятроўскія рэформы і культурна-цывілізацыйнае абнаўленне Расіі. Асветніцкая дзейнасць А.Канцеміра, В.Тацішчава, Ф.Пракаповіча, М.Ламаносава і інш. Тэатр і музыка (Ф.Волкаў, Д.Бартнянскі і інш.). Руская архітэктура і выяўленчае мастацтва (І.Нікіцін, А.Антропаў, І.Аргуноў, Ф.Рокатаў, Д.Лявіцкі, В.Бажэнаў, М.Казакоў, Б.Растрэлі і інш.).

Культура Расіі ў XIX – пачатку XX ст. Станаўленне стыляў і жанраў свецкай літаратуры (А.Сумарокаў, Г.Дзяржавін, М.Карамзін, А.Радзішчаў, Д.Фанвізін і інш.).

## Тэма 49. Культура Расіі ў XIX – пачатку XX ст.

Залаты век расійскай культуры. Рамантызм як кірунак у літаратуры (А.Пушкін, М.Лермантаў, В.Жукоўскі). Рэалізм у мастацтве і яго прадстаўнікі (М.Гогаль, Ф.Дастаеўскі, І.Тургенеў, Л.Талстой, М.Някрасаў, А.Астроўскі і інш.). Выяўленчае мастацтва (П.Фядотаў, І.Рэпін, А.Саўрасаў, І.Левітан і інш.). Расійская музычная культура (А.Барадзін, А.Даргамыжскі, М.Мусаргскі, М.Рымскі-Корсакаў, П.Чайкоўскі). Поспехі расійскай навукі (Д.Мендзялееў, А.Мажайскі, І.Мечнікаў, А.Сталетаў, К.Цыялкоўскі і інш.).

Сярэбраны век як своеасаблівы культурны рэнесанс. Інтэнсіўнасць культурнага жыцця. Шматстылёвасць у мастацтве. Абуджэнне інтэлектуальнага патэнцыялу. Росквіт расійскай філасофіі і багаслоўскай думкі (С.Булгакаў, М.Бярдзяеў, А.Лосеў, П.Фларэнскі, Г.Шпэт і інш.). Рускі касмізм. Кубізм, абстракцыянізм, футурызм у мастацтве (В.Кандзінскі, У.Маякоўскі, В.Хлебнікаў і інш.). Тэатралізацыя, гульня, фантастыка – адметнасць культуры сярэбранага веку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 50. Культура Беларусі ў сусветнай прасторы

Беларуская культура як навучальная дысцыпліна. Прадмет, мэты і задачы курса. Месца курса ў сістэме культуралагічнай адукацыі. Культурная спадчына як форма адлюстравання пераемнасці ў гістарычным развіцці грамадства. Традыцыі і навацыі ў развіцці нацыянальнай культуры. Супярэчлівы характар культурнага працэсу. Беларуская культура – тып адкрытай культуры. Гісторыя культуры як састаўная частка гісторыі грамадства і дзяржавы. Перыядызацыя гісторыі айчыннай культуры. Асноўныя крыніцы даследавання беларускай культуры. Дыяхронна-сінхронны падыход да вывучэння беларускай культуры. Палітычныя, эканамічныя і сацыякультурныя аспекты развіцця беларускай культуры

## Тэма 51. Генезіс і дынаміка беларускай культуры

Культура як сукупны духоўны вопыт народа. Паняцці генезісу і дынамікі культуры. Каштоўнасці і дынаміка культуры. Традыцыі і навацыі як механізмы культурнай дынамікі. Унутраныя і знешнія фактары культурных змяненняў. Роля міжкультурных узаемадзеянняў у дынаміцы культуры. Праблемы развіцця беларускай культуры.

Асноўныя крыніцы даследавання беларускай культуры эпохі культурагенезу. Балта-славянскае ўзаемадзеянне. Фактары развіцця ўсходнеславянскай супольнасці. Язычніцкія вераванні ва ўсходніх славян. Прыняцце хрысціянства – пераломная з'ява ў культуры ўсходніх славян. Спалучэнне хрысціянскіх і язычніцкіх тэндэнцый у культуры старажытных княстваў.

Пісьменнасць, кніжнасць і адукацыя на беларускіх землях. Помнікі старажытнай пісьменнасці. Старажытныя евангеллі: Тураўскае, Полацкае, Аршанскае. Летапісанне: Полацкі, Смаленскі і іншыя летапісы. "Слова аб палку Ігаравым" як агульны помнік культуры ўсходніх славян. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы і іх уклад у культуру: К.Смаляціч, К.Тураўскі, Е.Полацкая і інш.

Агульныя рысы манументальнага дойлідства. Архітэктура хрысціянскага храма, рысы раманска-візантыйскага стылю. Полацкая школа дойлідства: Сафійскі сабор, Барысаглебская царква ў Бельчыцах, Спаса-Ефрасіннеўская царква. Адхіленне ад візантыйскіх стандартаў, пошукі мясцовых архітэк-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турных формаў у полацкіх храмах. Гродзенская школа дойлідства: Барысаглебская царква і яе ўнікальнасць. Храмы Смаленска, Віцебска, Навагрудка. Манументальны жывапіс (фрэскі) у храмах.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: керамічныя і ювелірныя вырабы, мастацкае ліццё, апрацоўка дрэва, кавальская справа. Лазар Богша і крыж Е.Полацкай – вышэйшае дасягненне прыкладнога мастацтва.

## Тэма 52. Беларуская культура часоў Вялікага Княства Літоўскага

Фарміраванне культуры асноўных сацыяльных груп насельніцтва: сельскага, гараджан, шляхты. Роля шляхты ў развіцці духоўнай культуры.

Рэнесансныя ідэі ў Беларусі: умовы і фактары ўзнікнення. Агульнаеўрапейскія і спецыфічныя рысы беларускага Рэнесанса. Рэфармацыя і яе асаблівасці. Рэфармацыя і беларускае Адраджэнне.

Станаўленне і развіццё кнігавыдавецкай дзейнасці: друкарні ў Брэсце, Нясвіжы і інш. Ф.Скарына і яго роля ў беларускім Адраджэнні. Свецкая і царкоўная літаратура. Росквіт летапісання ў ВКЛ. Паэты-лацiністы: М.Гусоўскі, Я.Вісліцкі. Узнікненне новых жанраў літаратуры.

Прававая і грамадска-палітычная думка і яе ўплыў на культурнае жыццё. Статуты ВКЛ. Рэфармацыйна-гуманістычныя ідэі С.Буднага, В.Цяпінскага, Л.Сапегі.

Адукацыя і асвета ў ВКЛ. Праваслаўныя брацтвы. Віленская езуіцкая акадэмія. Вучоба беларусаў ва ўніверсітэтах Еўропы.

Архітэктура. Асноўныя архітэктурныя стылі: раманскі, беларуская готыка. Абарончы характар замкаў. Спалучэнне ў іх архітэктуры раманскіх і гатычных асаблівасцей. Замкавыя комплексы. Культавая архітэктура.

Выяўленчае мастацтва, беларуская школа іканапісу. Сувязь беларускай іконы з візантыйскай іканапіснай традыцыяй, заходнееўрапейскімі іканапіснымі прынцыпамі, эстэтыкай народнага мастацтва. Развіццё свецкага партрэта сармацкага тыпу – з’ява Рэнесанса. Развіццё мініяцюры і кніжнай графікі. Скульптура. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Школьны тэатр і тэатр лялек. Станаўленне прафесійнай музычнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 53. Беларуская культура другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст.

Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры. Распаўсюджанне каталіцызму і працэс паланізацыі ва ўмовах Рэчы Паспалітай. Рух Контррэфармацыі. Уніяцкая царква і беларуская мова ў ёй. Выцясненне беларускай мовы з дзяржаўнага ўжытку. Дэнацыяналізацыя беларускай шляхты.

Адукацыя і асвета. Развіццё школ каталіцкіх ордэнаў. Станаўленне навукі. Асветніцкая дзейнасць І.Храптовіча, М.Пачобута-Адляніцкага.

Развіццё барока ў розных відах мастацкай творчасці. Літаратура барока: высокае і нізкае. С.Полацкі і барочныя асаблівасці яго паэзіі. Рэлігійная палеміка ў літаратуры (М.Сматрыцкі). Сатырычныя творы як узоры нізкага барока ў Беларусі.

Развіццё беларускай школы іканапісу. Росквіт жанру свецкага партрэта, яго барочныя асаблівасці. Беларуская графіка. Творчасць братоў Тарасевічаў, свецкія сюжэты і партрэтныя работы. М. Вашчанка – выдавец і графік.

Станаўленне барочнай скульптуры. Мануфактурная вытворчасць. Слуцкія паясы, іх папулярнасць за межамі Беларусі.

Музычнае жыццё. Аркестры і капэлы. Развіццё школьнага тэатра, батлейкі. Магнацкія тэатры Радзівілаў, Сапегаў. Дзейнасць музычна-тэатральных школ. Сінтэз рэнесансных, барочных і класічных тэндэнцый у музыцы і тэатры.

Грамадская думка эпохі Асветніцтва. Ідэі К.Лышчынскага, С.Маймана. Дзейнасць І.Капіевіча, К.Нарбута.

## Тэма 54. Культура эпохі фарміравання беларускай нацыі (XIX ст.)

Беларусь у складзе Расійскай імперыі. Змены ў грамадска-палітычным жыцці беларускіх зямель і іх уплыў на культурнае жыццё. Ідэалогія “заходнерусізму”. Ліквідацыя ўніяцтва. Русіфікацыя і забарона беларускай мовы.

Фарміраванне беларускай нацыі. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў.

Адукацыя і асвета. Школьная рэформа. Тыпы школ. Школа як інструмент русіфікацыі. Вышэйшая адукацыя: Віленскі ўніверсітэт, Полацкая езуіцкая акадэмія, Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Развіццё сеткі настаўніцкіх семінарый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё беларусазнаўства. Вывучэнне гісторыі і этнаграфіі Беларусі. Дзейнасць І.Грыгаровіча, братоў Тышкевічаў, М.Без-Карніловіча. Стварэнне Віленскага музея старажытнасцей, Віленскай археалагічнай камісіі. Развіццё ў 2-й палове XIX ст. беларускай фалькларыстыкі, этнаграфіі, мовазнаўства (П.Шпілеўскі, І.Насовіч, М.Нікіфароўскі, П.Шэйн, М.Федароўскі, Э.Пякарскі).

Літаратурны рух, яго сувязь з ідэалогіяй Асветніцтва. Паэты-філаматы: Я.Чачот, А.Міцкевіч, Т.Зан. Ананімная літаратура на беларускай мове. Беларускія матывы ў творчасці А.Міцкевіча. Польская літаратура Беларусі як з'ява беларускай культуры XIX ст.: Я.Баршчэўскі, В.Дунін-Марцінкевіч. Станаўленне беларускіх нацыянальных тэндэнцый у літаратуры. Творчасць Ф.Багушэвіча. Станаўленне беларускай драматургіі. В.Дунін-Марцінкевіч і яго творы.

Вядучыя кірункі выяўленчага мастацтва: класіцызм, рамантызм, рэалізм. Інтэнсіўнае развіццё жывапісу, яго свецкі характар. Класіцызм у беларускім жывапісе. Сувязь рамантызму і рэалізму як фактар развіцця жывапісу Беларусі ў XIX ст. Віленская школа жывапісу. Асноўныя жанры: партрэт (І.Аляшкевіч, В.Ваньковіч, Я.Дамель, І.Хруцкі і інш.), пейзаж (В.Дмахоўскі, А.Гараўскі, Ф.Рушчыц і інш.), гістарычны (Ф.Смуглевіч, Я.Сухадольскі, Я.Дамель, К.Альхімовіч), бытавы (К.Кукевіч, Т.Гарэцкі). Архітэктурна-гістарычныя і этнаграфічныя кампазіцыі Н.Орды як летапіс замкаў і сядзіб Беларусі.

Скульптура. Творчасць К.Ельскага, Р.Слізеня, Я.Астроўскага.

Станаўленне класіцызму ў архітэктуры. Планіроўка гарадоў, фарміраванне гарадскіх ансамбляў, адміністрацыйныя будынкі. Палацава-сядзібная архітэктура. Адыход ад класіцызму і развіццё эклектыкі. Псеўдарускі стыль архітэктуры.

Творчасць беларускіх кампазітараў: М.-К.Агінскі, А.Абрамовіч, М.Ельскі, Ф.Міладоўскі. Станаўленне опернага мастацтва. С.Манюшка ў гісторыі беларускай культуры.

## Тэма 55. Беларускае нацыянальнае адраджэнне і развіццё культуры ў пачатку XX ст.

Палітычныя, эканамічныя і сацыякультурныя аспекты развіцця беларускай культуры ў пачатку XX ст. Грамадска-палі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тычны рух і яго ўплыў на культурнае жыццё. Нацыянальна-культурны ўздым, рост беларускай інтэлігенцыі. Беларуская сацыялістычная грамада і яе роля ў адраджэнні культурнага жыцця Беларусі.

Развіццё нацыянальнага друку. Беларуская перыёдыка: "Наша ніва", "Наша доля", "Гоман", "Саха", "Лучына", "Вольная Беларусь". Роля перыядычных выданняў у развіцці беларускай культуры.

Змены ў сістэме адукацыі ў пачатку ХХ ст. Рух за дэмакратызацыю школы і стварэнне беларускай школы. Стварэнне культурна-адукацыйных навуковых аб'яднанняў. Рост беларусазнаўства: гістарычныя, мовазнаўчыя, этнаграфічныя даследаванні. Дзейнасць Я.Карскага, М.Доўнар-Запольскага, В.Ластоўскага, Б.Тарашкевіча, братоў Луцкевічаў.

Развіццё жанраў і стыляў літаратуры. Творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Цёткі, З.Бядулі, М.Гарэцкага, Ц.Гартнага і іншых.

Музыка і тэатр. Беларускія вечарыны. Творчая дзейнасць беларускіх гурткоў у Вільні, Пецярбургу, Гродне, Варшаве, Мінску. І.Буйніцкі – заснавальнік беларускага прафесійнага тэатра. Стварэнне харавых гурткоў і аркестраў. Выкарыстанне фальклору ў творчасці беларускіх кампазітараў (М.Чуркін, А.Грыневіч).

Імкненне да стварэння нацыянальнай мастацкай школы, да нацыянальнай своеасаблівасці – характэрныя рысы выяўленчага мастацтва пачатку ХХ ст. Актывізацыя мастацкага жыцця, арганізацыя выставак. Мастацкі рух у Віцебску. Мастацкая школа Ю.Пэна. Уплыў мадэрнізму на развіццё мастацтва. Росквіт пейзажа. Творчасць В.Бялыніцкага-Бірулі, Ф.Рушчыца, С.Жукоўскага. Дэмакратычнасць, імкненне да стварэння нацыянальных вобразаў у графіцы. Імпрэсіянізм і мадэрн у скульптуры. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: прамысловы і народны кірункі.

Горадабудаўніцтва і архітэктура. Стыль мадэрн. Развіццё неакласіцызму і неараманскага стылю.

### Тэма 56. Станаўленне беларускай культуры

Утварэнне БССР. Палітыка беларусізацыі: сутнасць і задачы. Перавод на беларускую мову дзяржаўных устаноў і арганізацый. Дзейнасць Інстытута беларускай культуры. Бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руская акадэмія навук. Меры па ліквідацыі непісьменнасці. Развіццё беларускай школы. Стварэнне сістэмы школьнай адукацыі. Станаўленне вышэйшай адукацыі ў Савецкай Беларусі.

Беларуская грамадская думка пачатку XX ст. Асэнсаванне гісторыка-культурнага працэсу: І.Абдзіраловіч, М.Багдановіч, Я.Купала, Я.Колас і інш.

Асноўныя напрамкі развіцця беларускай савецкай літаратуры. Творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, У.Дубоўкі, М.Лынькова, К.Крапівы, М.Зарэцкага, К.Чорнага і інш. Змены нацыянальнай палітыкі ў канцы 20-х гг. Рэпрэсіі супраць творчай інтэлігенцыі.

Развіццё беларускага прафесійнага тэатра. Беларускія дзяржаўныя тэатры: БДТ-1, БДТ-2. Іх рэпертуар, нацыянальны кірунак дзейнасці. Вандроўная трупа У.Галубка і стварэнне БДТ-3. Зварот да фальклорных сюжэтаў у драматургіі (В.Вольскі “Несцерка”).

Музычнае жыццё Беларусі. Стварэнне першых беларускіх савецкіх опер. Творчасць М.Чуркіна, М.Аладава, А.Туранкова. Арганізацыя Акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР, Беларускага дзяржаўнага ансамбля народных інструментаў. Адкрыццё Беларускай кансерваторыі, Дзяржаўнай філармоніі. Станаўленне сімфанічнага жанру. Апрацоўка народных песень. Тэндэнцыі да палітызацыі музыкі.

Станаўленне “Белдзяржкіно”. Ю.Тарыч – пачынальнік беларускага кінематографа. Першыя беларускія мастацкія і дакументальныя фільмы. Гістарычна-рэвалюцыйныя сюжэты ў фільмах 20-х гг. Экранізацыя беларускай прозы і выкарыстанне беларускай мовы ў кіно.

Разнастайнасць плыняў і кірункаў у беларускім выяўленчым мастацтве. Адмаўленне ад традыцый і абсалютызацыя наватарства ў творчасці мастакоў-авангардыстаў: К.Малевіч, М.Шагал, Л.Лісіцкі. Выцясненне мадэрнізму строгім рэалізмам. Сацыялістычны рэалізм як вядучы кірунак савецкага выяўленчага мастацтва. Творчасць М.Волкава, Ю.Пэна, Я.Кругера, П.Гаўрыленкі. Пейзажы М.Станюты, У.Кудрэвіча. Зварот да этнаграфіі і фальклору, нацыянальная самабытнасць творчасці М.Філіповіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 57. Савецкая беларуская культура ў перыяд сацыялістычнага рэалізму

Дыяметральныя ацэнкі савецкай культуры. Марксізм-ленінізм як афіцыйная ідэалогія СССР. Дзяржаўна-адміністрацыйны ціск на культуру. Цэнтралізацыя і камандаванне ў сферы культуры. Эміграцыя дзеячаў савецкай культуры.

Пралетарскі кірунак у культуры. “Новасялянская культура” і інш. Савецкае тэатральнае мастацтва (Г.Глебаў, В.Елізар’еў, Я.Міровіч, С.Станюта і інш.). Развіццё беларускага кінематографа (У.Корш-Саблін, Л. Голуб, М.Пташук і інш.).

Рэпрэсіўны перыяд у развіцці культуры. Хрушчоўска-брэжнеўская адліга і яе ўплыў на культурнае жыццё. Росквіт культуры ў 60-х гг. ХХ ст. (І.Шамякін, М.Лынькоў, В.Быкаў, У.Караткевіч і інш.). Дасягненні беларускай навукі і адукацыі.

Нэакансерватыўныя тэндэнцыі ў перыяд застою. Дысідэнцкі рух дзеячаў культуры.

Пераадоленне ідэалагічных бар’ераў у перыяд застою. Актыўнае засваенне заходніх культурных стандартаў. Плюралістычнасць і шматстылёвасць культуры. Імкненне адрадзіць духоўную спадчыну. Новая хваля культурнай эміграцыі. Супрацьстаянне інтэлектуалаў і традыцыяналістаў.

## Тэма 58. Сфера культуры як аб’ект навуковых даследаванняў

Анталагічны і гнасеалагічны сэнс культуры. Культурная разнастайнасць і неабходнасць яе даследавання. Заканамернасці і механізмы функцыянавання і развіцця культуры як атрыбута сацыяльнай сістэмы. Раскрыццё ўнутраных сэнсаў артэфактаў культуры, вобразаў, форм і сэнсаў, якія ўтрымліваюцца ў іх, задача навукі аб культуры. Спецыфіка пазнавальных адносін чалавека да культуры. Праблемнае поле культуралогіі: фундаментальныя і прыкладныя культуралагічныя даследаванні.

Аб’ект даследавання як фрагмент культурнага працэсу ці з’явы культуры. Мэты, задачы і ўмовы навуковага даследавання. Сродкі даследавання.

Праграма навуковага даследавання ў сферы культуры. Аб’ектыўная абумоўленасць распрацоўкі праграмы даследавання. Месца і роля праграмы ў навуковым даследаванні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма як тэарэтычная мадэль даследавання асноўных яе метадалагічных прынцыпаў, методык і працэдур.

Структура праграмы. Тэарэтычна-метадалагічны і практычна-метадычныя раздзелы. Метадалагічны раздзел: фармулёўка праблемы, мэты і задачы даследавання; вызначэнне аб’екта і прадмета даследавання; распрацоўка рабочых гіпотэз.

Працэдурна-метадычны раздзел: выбар і абгрунтаванне метадаў збору інфармацыі; вызначэнне выбарачнай сукупнасці (выбаркі); распрацоўка інструментарыя даследавання; распрацоўка арганізацыйна-тэхнічных працэдур (тэрміны, графікі і інш.).

### Тэма 59. Метады культуралагічных даследаванняў

Метад (ад грэч. methodos – шлях даследавання ці пазнання) – сукупнасць правіл, прыёмаў і аперацый практычнага або тэарэтычнага асваення рэчаіснасці.

Метад як сукупнасць прадпісанняў, якія рэгламентуюць змест і паслядоўнасць пазнавальных дзеянняў, аперацый і працэдур даследавання.

Класіфікацыя навуковых метадаў: непасрэдныя і апасродкаваныя, якасныя і колькасныя, апісальныя і тлумачальныя, змястоўныя і фармальныя.

Агульналагічныя метады: параўнанне, аналіз, сінтэз, абстрагаванне, індукцыя, дэдукцыя, аналогія, мадэліраванне.

Метады эмпірычнага даследавання:назіранне, апісанне, вымярэнне, аналіз дакументаў, апытанне, эксперымент.

Метады тэарэтычнага даследавання: мысленны эксперымент, ідэалізацыя, фармалізацыя, аксіяматычны метад, гіпатэтыка-дэдуктыўны метад, пераход ад абстрактнага да канкрэтнага, метад адзінства культурна-гістарычнага і лагічнага.

Метады культуралагічнага аналізу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага светапогляду / І. Абдзіраловіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Библер, В. С.* Культура. Диалог культур / В. С. Библер // Вопросы философии. – 1989. – № 6. – С. 33–38.

3. *Гуревич, П. С.* Культурология / П. С. Гуревич. – М.: Знание, 1994. – 288 с.

4. *Иконникова, С. Н.* История культурологии. Идеи и судьбы / С. Н. Иконникова. – СПб.: Санкт-Петербург. гос. академия культуры, 1996. – 264 с.

5. *Кармин, А. С.* Культурология / А. С. Кармин. – СПб.: Питер, 2001. – 464 с.

6. *Маркарян, Э. С.* Теория культуры и современная наука / Э. С. Маркарян. – М.: Мысль, 1983. – 284 с.

7. *Мартынов, В. Ф.* Культурология. Теория культуры: учеб. пособие / В. Ф. Мартынов. – Мн.: АСАР, 2008. – 848 с.

8. *Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

9. *Смолік, А. І.* Культуралогія: гісторыя культуры: вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, А. А. Цобкала. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 311 с.

10. *Усовская, Э. А.* Постмодернизм в культуре ХХ в. / Э. А. Усовская. – Мн.: БГУ, 2003. – 63 с.

11. *Флиер, А.* Культурология для культурологов / А. Флиер. – М.: Академический проект, 2000. – 492 с.

*Дадатковая*

1. *Гуревич, А. Я.* Средневековый мир: культура безмолвствующего большинства / А. Я. Гуревич. – М.: Искусство, 1990. – 396 с.

2. *Данилевский, Н. Г.* Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германороманскому / Н. Г. Данилевский. – М.: Книга, 1991. – 574 с.

3. *Каган, М. С.* Философская теория ценностей / М. С. Каган. – СПб.: Петрополис, 1997. – 205 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Камю, А.* Бунтующий человек / А. Камю. – М.: Политиздат, 1990. – 415 с.

5. *Лосев, А. Ф.* Эстетика Возрождения / А. Ф. Лосев. – М.: Мысль, 1982. – 623 с.

6. *Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

7. *Ортега-и-Гассет, Х.* Восстание масс / Х. Ортега-и-Гассет // Х. Ортега-и-Гассет. Избранные труды. – М.: Весь мир, 2000. – 704 с.

8. *Почепцов, Г. Г.* Теория коммуникаций / Г. Г. Почепцов. – М.: Релф-бук, 2001. – 656 с.

9. *Сорокин, П. А.* Человек. Цивилизация. Общество / П. А. Сорокин. – М.: Политиздат, 1992. – 544 с.

10. *Тайлор, Э. Б.* Первобытная культура / Э. Б. Тайлор. – М.: Наука, 1989. – 612 с.

11. *Тойнби, А. Дж.* Постижение истории / А. Дж. Тойнби. – М.: Прогресс, 1991. – 640 с.

12. *Тоффлер, Э.* Третья волна / Э. Тоффлер. – М.: АСТ, 2002. – 776 с.

13. *Уайт, Л.* Избранное: наука о культуре / Л. Уайт. – М.: РОССПЭН, 2004. – 960 с.

14. *Фрейд, З.* Психоаналитические этюды / З. Фрейд. – М.: АСТ, 2004. – 220 с.

15. *Фромм, Э.* Человек для себя. Иметь или быть? / Э. Фромм. – Мн.: Коллегиум, 1997. – 253 с.

16. *Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М.: АСТ, 2003. – 603 с.

17. *Хёйзинга, Й.* Осень средневековья / Й. Хёйзинга. – М.: Наука, 1988. – 544 с.

18. *Чернявская, Ю. В.* Белорусы. От «тутэйшых» – к нации / Ю. В. Чернявская. – Мн.: ФУАинформ, 2010. – 512 с.: ил.

19. *Юнг, К.-Г.* Психология бессознательного / К.-Г. Юнг. – М.: Канон, 1994. – 320 с.

20. *Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К. Ясперс. – М.: Политиздат, 1991. – 528 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ**

*Праграма дзяржаўнага экзамену для студэнтаў*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія*
*(фундаментальная)*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*


Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 2,21. Ул.-выд. арк. 1,71.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ